**УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ ЯК ЛЮСТЭРКА ПРАКТЫЧНАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ БЕЛАРУСІ: САЦЫЯЛЬНЫ ЗАПЫТ І ЯКАСЦЬ СПРАВАЗДАЧНАСЦІ**

ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА!

Дарагія ўдзельнікі традыцыйнай канферэнцыі па фальклоры, замежныя госці, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, магістранты і аспіранты ўніверсітэта, калегі з іншых навучальных устаноў і навуковых цэнтраў, удзельнікі фальклорных калектываў!

Як рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў я маю гонар звярнуцца да Вас з урачыстай нагоды адкрыцця XII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»!

У свой час у гуманітарных навуковых колах стала бестселерам кніга Маргарэт Мід «Сталенне на Самоа́», напісаная пасля наведвання архіпелага ў акеане, дзе жылі шчырыя і самадастатковыя людзі, вольныя ад шэрага забабонаў Заходняй цывілізацыі. Даследчыца прыйшла да высновы, што ў традыцыйным асяродку няма псіхічных захворванняў, няма праблем пубертатнага перыяду – падлеткі не бунтуюць супраць бацькоў. Няма людзей, якія не ўключаныя ў супольныя дзеі і няма адзінокіх. Усе жывуць у сем'ях. Ніхто нікога не прымушае, не навязвае пэўных сацыяльных функцый, сам лад жыцця вымагае асобу да сацыяльнай актыўнасці і камунікацыі. Пасля гэтага псіхолагі сталі крытычна пераглядаць многія нормы, што дамінуюць у сучасным цывілізаваным свеце і больш уважліва вывучаць шэраг аспектаў традыцыйнага выхавання, інкультурацыі і сацыялізацыі.

Ад пачатку свайго заснавання Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў з'яўляецца значным цэнтрам вывучэння, рэканструкцыі і захавання створаных нашымі продкамі ведаў, уменняў, творчых прыёмаў, мастацкіх праяўленняў, абрадаў, свят і іншых традыцыйных каштоўнасцей. Вялікае значэнне для фарміравання свядомасці і культуры сучаснага чалавека мае жыццёвая мудрасць, этыка, экалагічнасць светапогляду беларускага народа, якія выпрацоўваліся стагоддзямі, а, магчыма, – і тысячагоддзямі.

У нашым універсітэце не толькі цікавяцца традыцыйнай беларускай культурай і шануюць яе. Вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы спецыялістаў-практыкаў у розных галінах беларускага народнага мастацтва (народных спевах, народным танцы, народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, народным тэатры, традыцыйных святах і іншых напрамках і спецыяльнасцях), калекцыяніраванні і захаванні артэфактаў у музеях і экспазіцыях, спецыялістаў у галіне этналогіі і этнафоназнаўства.

Па сацыяльным заказе нашага грамадства не першы год вядзецца мэтанакіраваная праца па рэканструкцыі, навуковым апісанні і інтэрпрэтацыі разнастайных з'яў народнай культуры. Сярод славутых імен беларускіх фалькларыстаў і даследчыкаў народнай культуры з гонарам узгадаем прафесараў нашага ўніверсітэта Міколу Грынчыка, Івана Цішчанку, Уладзіміра Грома і іншых, чые традыцыі сёння доўжаць Энгельс Дарашэвіч, Аляксей Рагуля, Рыгор Шаўра, Наталля Яканюк. Наўрад ці іншы айчынны ўніверсітэт вядзе планамерна скіраваную на практычную фалькларыстыку дзейнасць, у выніку якой выдадзены манаграфіі і зборнікі даследчых работ, абаронены дысертацыі па адпаведнай тэматыцы. Навуковы аналіз гістарычнага і сучаснага стану традыцыйнай беларускай культуры, аўтэнтычнага фальклору дае падставу для вызначэння прыярытэтаў культурнага і грамадскага развіцця нашай краіны, вырашэння праблем адукацыі, выхавання, інкультурацыі, інфармацыйнай бяспекі, экалогіі, дэмаграфіі і іншых.

У аспекце справаздачнасці па сацыяльным заказе на практычную фалькларыстыку варта адзначыць, што наш універсітэт культуры і мастацтваў славуты сваімі мастацкімі калектывамі, у творчай дзейнасці якіх знайшлі ўвасабленне разнастайныя з'явы і формы традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў. Прыкладам з'яўляецца вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі», якім на працягу 30 гадоў кіраваў вядомы даследчык, заслужаны работнік культуры БССР Станіслаў Дробыш, ансамбль «Грамніцы» (мастацкі кіраўнік — прафесар Уладзімір Зяневіч), ансамбль кафедры харэаграфіі пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры, прафесара Святланы Гуткоўскай, фальклорны калектыў «Талака» кафедры этналогіі і фальклору і многія іншыя.

Зразумела, што ўся гэтая шматгранная праца па захаванні і развіцці традыцыйнай беларускай культуры, якая ажыццяўляецца ва ўніверсітэце, робіцца пры падтрымцы органаў дзяржаўнага кіравання, за што мы ім вельмі ўдзячныя. Створаныя дзяржавай ўмовы для ўключэння нацыянальнай культурнай спадчыны ў жыццё сучаснага грамадства спрыяюць дзейнасці ўніверсітэта як асяродка вывучэння і выкарыстання здабыткаў традыцыйнай мастацкай культуры, а таксама кадравага забеспячэння розных напрамкаў айчыннай практычнай фалькларыстыкі.

Сардэчна жадаю плённай працы, вялікіх поспехаў, навуковых і творчых дасягненняў усім беларускім удзельнікам канферэнцыі, нашым гасцям з іншых краін, носьбітам фальклору з калектываў, якія сёлета завіталі да нас і бяруць удзел як у навуковай рабоце, так і ў творчай, практычна-фалькларыстычнай частцы канферэнцыі.

Рэктар Аліна КОРБУТ
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ